МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ УНИВЕРСНТЕТ
ИМЕНИ МАКСИМА ТАНКА
БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ
ПЕДАГОГИЧЕСКОЕ ОБЩЕСТВО РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

# ТЕОРЕТИЧЕСКОЕ НАСЛЕДИЕ В.А. СУХОМЛИНСКОГО В СОВРЕМЕННОЙ ШКОЛЕ

Матерналы Республнканского
научно-практического семинара

7796
Бібліятэка
БДПУ імя М.Танка

МИНСК 1998

накопление ими опыта гуманного поведения.

– В основе такой работы лежит формирование эмоциональной культуры личности. Успешному ее воспитанию способствует продуманная система педагогических средств и методов, «гармония педагогических воздействий».

– В нашей экспериментальной работе в этих целях использовалось содержание учебного материала и, прежде всего, уроков чтения и внеклассного чтения, с помощью которых дети глубоко осознают разные стороны проявления гуманного отношения человека к другим людям (бескорыстие, щедрость, помощь, сочувствие); этические беседы, назначение которых – углубление знаний, обогащение чувств; организация разнообразной деятельности детей, нацеленной на «творение добра, радости» для другого.

– Мы убедились, что воспитательные воздействия будут успешными, если школьники осознают значимость гуманных отношений к людям; содержание деятельности для других интересно детям, привлекательно для них; организация деятельности для других осуществляется параллельно с работой по нравственному просвещению младших школьников.

## РОЛЯ КАЗКІ Ў РАЗВІЦЦІ МАСТАЦТВА МАЎЛЕННЯ СТАРЭЙШАГА ДАШКОЛЬНІКА

***Дубініна Дз.М.***

Развіццё маўлення дашкольнікаў, навучанне роднай мове даследчыкі цесна звязваюць з вырашэннем задач мастацка-маўленчай дзейнасці. Умение дашкольнікаў будаваць звязнае маналагічнае выказванне ўключае азнаямленне дзяцей з выразна-выяўленчымі сродкамі мастацкага тэксту. Авалодванне гэтымі моўнымі сродкамі служыць развіццю мастацкага ўспрымання літаратурных твораў, якое захоўвае свой эмацыянальна-непасрэдны характар, г.зн. застаецца сапраўды эстэтычным успрыманнем. Такім чынам, у дзіцяці фарміруюцца свядомыя адносіны да маўлення ў яго эстэтычнай функцыі, якая праяўляецца ў выбары моўных выразна-выяўленчых сродкаў для стварэння мастацкага вобраза.

Адным з асноватворных сродкаў навучання мастацтву маўлення з'яўляюцца казкі. Паводле В.А.Сухамлінскага, праз казку, праз казачныя вобразы ў свядомасць дзіцяці якраз і ўваходзіць слова з усімі сваімі адценнямі. Увогуле, на думку выдатнага педагога, без казкі, якая авалодвае ўсімі пачуццямі маленькага чалавека, немагчыма ўявіць сабе развіццё дзіцячага маўлення. В.А.Сухамлінскі лічыць, што менавіта пад уплывам казачных вобразаў і тых пачуццяў, што яны выклікаюць, дзіця вучыцца

мысліць словамі.

Сярод казак сваёй маляўнічасцю вызначаюцца казкі пра жывёл. Што да беларускіх народных казак пра жывёл, то яны ўвогуле з'яўляюцца перламі ўсходнеславянскага казачнага эпасу. Менавіта гэтым казкам уласцівы такі казачны склад, які знаходзіцца ў цеснай сувязі з іншымі відамі народнай паэзіі: песнямі, трапнымі выразамі, прыказкамі і прымаўкамі, загадкамі. У сувязі з гэтым педагагічнае майстэрства выхавальніка павінна быць накіравана на тое, каб дзіця атрымала эстэтычную асалоду ў час слухання казкі, заўважыла яе маляўнічую, яскравую, трапную, мілагучную мову. Неабходна дапамагчы яму заўважыць, што трава ў казках – шаўковая, ветрык – буйны, а лісіца – хітрыца. Каб замацаваць гэтыя прыгожыя словы ў слоўніку дашкольніка, можна выкарыстаць прыём падбору мастацкіх азначэнняў да той ці іншай рэчы, з'явы, казачнага вобраза. Дзейсным тут будзе і пошук слоў, якія робяць казку прыгожай, і складанне апісальнай характарыстыкі казачнага героя, і прыдумванне сказаў з прыгожымі казачнымі словазлучэннямі. Узбагаціцца «моўнае поле» дзіцяці таксама ў час правядзення спецыяльных гульняў з прыгожымі казачнымі словамі. Напрыклад, «Закончы казачны выраз», «Якога слова не хапае», «Хто больш знойдзе прыгожых казачных слоў».

Маюць месца ў казках і эпітэты-прыдаткі. Сапраўдны майстар сваёй справы павінен звярнуць увагу дзіцяці на гэтыя эпітэты, падкрэсліць яркую характарыстыну казачнага вобраза і прапанаваць дашкольнікам творча яе дапоўніць, стварыць свой уяўляемы вобраз і даць яму цікавую назву, якая можа быць толькі ў казцы. Лепш адчуць тонкія адценні вобразнага слова дапаможа работа з дзецьмі над яго семантыкай. Словы, нават і самыя блізкія па значэнні, звычайна адрозніваюцца асаблівай эмацыянальнай афарбоўкай, часам амаль няўлоўнай, але якая мае ў мастацкім тэксце вялікае значэнне. Неабходна развіць у дзіцяці асабістае пачуццё да шматлікіх нюансаў гэтага слова з дапамогай спецыяльных заданняў. Па-першае, гэта састаўленне сінанімічных радоў, калі дзецям прапануецца падабраць словы, блізкія па значэнні да пэўнага слова. Па-другое, гэта вызначэнне слова, якое прапушчана ў тэксце казкі, і падбор да яго слоў, блізкіх па значэнні. Акрамя таго, выхавальнік можа прапанаваць дзецям 2-3 словы сінанімічнага рада і загадаць скласці сказы з гэтымі словамі. Станоўча спрыяе развіццю вобразнага маўлення дзіцяці мастацкі пераказ казкі, дзе прыгожымі вобразнымі словамі і выразамі можна распавядаць пра тое, што больш за ўсё кранула ўсведамленне дашкольніка, ці апісаць прыгожае месца дзеяння, герояў, якія спадабаліся. Улічыць у сваім пераказе моўныя асаблівасці героя твора дапаможа такі цікавы прыём, як расказванне казкі ад імя аднаго з яе герояў.

Карысным для развіцця «дара слова» ў дашкольнікаў з'яўляецца ўжыванне славеснага малявання, пры якім асабістыя пачуцці ўвасабляюцца ў славесным апісанні вобраза ці месца дзеяння. Дзеці могуць намаляваць карцінкі пра тое, што ім больш за ўсё спадабалася, але не фарбамі, а словамі, ды яшчэ так, каб усе астатнія маглі ўявіць сабе маляўнічую карцінку з казкі, пра якую расказвае дзіця.

Народныя казкі знаёмяць дзяцей з прыгожымі параўнаннямі, трапнымі выразамі, прыказкамі, якія паэтызуюць мову дашкольнікаў, робяць яе сакавітай, вобразнай.

Гульня-драматызацыя па сюжэце народнай казкі выступае адным з асноватворных прыёмаў развіцця выразнага і вобразнага маўлення дашкольнікаў. Лепш для гульні-драматызацыі браць народныя казкі пра жывел. Менавіта гэтыя казкі вызначаюцца невялікім аб'емам і тыповымі казачнымі формуламі, мова іх вельмі простая і дакладная, аднак самыя звычайныя, на першы погляд, словы ў тэксце казак набываюць здзіўляючую выразнасць, трапнасць і прыгажосць.

Вельмі станоўчым з'яўляецца і той факт, што гэтыя казкі маюць шматлікія паралелі ва ўсходнеславянскім фальклоры. Неабходна адзначыць, што падобныя сюжэты і вобразы вуснай народнай творчасці рускага і беларускага народаў не прывялі да стварэння адзінага фальклорнага эсперанта, а, наадварот, выявілі адметнасць і своеасаблівасць нацыянальнай мовы, яе выразнасць і вобразнасць. Улічваючы той факт, што з рускай народнай творчасцю дзеці знаемяцца значна раней, чым з беларускім фальклорам, неабходна скіроўваць увагу выхаванцаў на падабенства сюжэтаў і вобразаў двух роднасных казачных твораў. Гэта значна паглыбляе ўспрыманне зместу беларускай народнай казкі і станоўча адбіваецца на яе творчым узнаўленні ў працэсе гульні-драматызацыі.

Дакладнае веданне дзецьмі сюжэту казак, якія вызначаюцца сваімі блізкароднаснымі паралелямі, дазваляе выхавальніку звярнуць увагу дашкольнікаў на нацыянальныя асаблівасці гучання беларускай мовы.

Пры наладжванні гульні-драматызацыі можна выкарыстоўваць наступныя паралелі казачнай творчасці: «Ліса і заяц» – «Зайкава хатка», «Зимовье зверей» – «Пра быка і яго сяброў», «Коза-дереза» – «Каза-манюка», «Кот і ліса» – «Коцік, пеўнік і лісіца», «Теремок» – «Дзедава рукавічка», «Петушок и бобовое зернышко» – «Як курачка пеўніка ратавала». В.А.Сухамлінскі заўважаў, што «дзеці павінны жыць у свеце прыгажосці, гульні, казкі». Гульня – драматызацыя якраз і з'яўляецца для дзіцяці гэтым чароўным светам. Разам з гульневой матывацыяй яна вызначаецца і сваёй камунікатыўнай накіраванасцю. Менавіта ў гульні-драматызацыі з рэпрадуктыўным маўленнем (запазычанне моўных узораў літаратурнага

тэксту) спалучаецца прадуктыўнае. Акрамя таго, у час яе правядзення з найбольшай дакладнасцю праяўляецца патэнцыял успрымання дзецьмі мастацкага твора, які пры ўзнаўленні тэкста раскрываецца з дапамогай прыемаў літаратурнай тэхнікі і сродкаў мастацкай выразнасці. Пры гэтым неабходна ўлічваць, што варыятыўнасць маўленчых паводзін дзяцей у гульні-драматызацыі залежыць і ад іх індывідуальных магчымасцей, тым больш, што сацыяльныя ролі, якія выконваюць маленькія ўдзельнікі гульні, патрабуюць ад іх пэўнай выразнасці і вобразнасці маўлення.

Улічваючы наяўнасць блізкароднасных паралеляў паміж рускімі і беларускімі казкамі, дзяцей лепш папрасіць успомніць рускія народныя казкі, вызначыць з імі тэму, сюжэт і сродкі мастацкай выразнасці гэтых казак. Праз некалькі тыдняў увазе дзяцей прапаноўваецца адпаведная беларуская народная казка. Дашкольнікі знаемяцца з яе сюжэтам, вобразамі і яскравай, сакавітай мовай. Пры гэтым праводзіцца параўнальны аналіз беларускай і рускай народнай казкі. Потым дзеці ўзнаўляюць казку ў гульні-драматызацыі. Успрыманне казкі з узнаўленнем яе ў гульні-драматызацыі спрыяе мастацкаму развіццю дзіцяці. У час гульнявых дзеянняў дзеці звяртаюцца адзін да аднаго на мове казачных герояў, выкарыстоўваючы пры гэтым у сваім маўленні вобразныя словы і выразы. Такім чынам, менавіта гульня-драматызацыя па народнай казцы дапамагае, як зазначаў В.А.Сухамлінскі, зрабіць так, каб слова для дзіцяці было не проста абазначэннем рэчы ці з'явы, а несла ў сабе пэўную эмацыянальную афарбоўку – свой водар, свае надзвычай тонкія адценні.

## РОЛЯ ДЗІЦЯЧЫХ І МАЛАДЗЁЖНЫХ АБ'ЯДНАННЯЎ У САЦЫЯЛІЗАЦЫІ ШКОЛЫ

***Варанецкая Л.М.***

Сацыяльна-эканамічная і маральна-псіхалагічная напружанасць жыцця грамадства, палітычная нестабільнасць, міжнацыянальныя супярэчнасці суправаджаюцца крызісам духоўных каштоўнасцей, якія склаліся за гады савецкай улады. У сувязі з гэтым адсутнічае яскрава вызначаная мэта – ідэал выхавання, які ляжыць у аснове працэсу сацыяльнага станаўлення асобы. Вядучыя суб'екты выхаваўчай дзейнасці: інстытуты дзяржавы, педагогі, бацькі, дзіцячыя і маладзёжныя грамадскія аб'яднанні сёння недакладна ўяўляюць сабе канкрэтныя магчымасці існавання ва ўмовах сучасных інавацыйных працэсаў.

Маладзёжныя і дзіцячыя грамадскія арганізацыі і аб'яднанні вызначаюць у якасці актуальнай задачы выхавання фарміраванне ў падрастаючага пакалення высокага ўзроўню культурнага самавызначэння ў